# § 47. Гуманізм і Адраджэнне на тэрыторыі Беларусі

ГРАВЮРА
МІКОЛА ГУСОЎСКІ
ФРЭСКА АДРАДЖЭННЕ
ЛЕТАПІС ШКОЛА ІКАНАПІСУ
ХРАМЫ-КРЭПАСЦІ
ФРАНЦЫСК СКАРЫНА

Перадумовы Рэнесансу

**1. Асаблівасці эпохі Адраджэння на тэрыторыі Беларусі.** У канцы XV — першай палове XVI ст. на тэрыторыі Беларусі адбывалася развіццё гарадоў, секулярызацыя грамадскага жыцця (вызваленне ад рэлігійнага ўплыву), фарміраванне беларускай народнасці. Усе гэтыя працэсы разам з пашырэннем міжнародных сувязей ВКЛ сталі перадумовамі для надыходу эпохі Рэнесансу.

## ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ РЭНЕСАНСНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

**Першая палова XVI ст.**
Развіццё кнігадрукавання, з'яўленне агульнадзяржаўнага заканадаўства, новалацінскай паэзіі

**Сярэдзіна XVI — пачатак XVII ст.**
Уплыў Контррэфармацыі на свецкую і духоўную культуру Беларусі

Як вы разумееце тэрмін «Адраджэнне»? Што намагаліся адрадзіць дзеячы культуры напрыканцы сярэдневяковай эпохі?

**Бона Сфорца**

Пашырэнне гуманістычных ідэй на тэрыторыі Беларусі ў канцы XV — першай палове XVI ст. было шчыльна звязана з дзейнасцю жонкі вялікага князя Жыгімонта I Старога, Боны Сфорцы, дачкі міланскага герцага, а таксама прадстаўнікоў мясцовай знаці — магнатаў і шляхты. Яны актыўна падтрымлівалі культурныя абмены з Захадам, запрашалі італьянскіх майстроў мастацтва — мастакоў, скульптараў і архітэктараў. Атрыманне адукацыі ў еўрапейскіх універсітэтах дазволіла прадстаўнікам вышэйшага саслоўя азнаёміцца з дасягненнямі Антычнасці і сучаснай ім літаратуры. Апроч таго, яны калекцыянавалі старажытныя рукапісы і артэфакты, тым самым спрыялі пашырэнню ведаў і культурнай спадчыны.

Адным з яскравых прыкладаў гэтага культурнага росквіту з’яўляецца паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». У гэтым творы аўтар выходзіць за межы простага апісання палявання на зубра, паглыбляецца ў філасофскі роздум пра лёс сваёй радзімы, яе гістарычны шлях і значнасць.

**Поліканфесійнасць і шматмоўнасць**

Культура адукаваных колаў грамадства працягвала заставацца поліканфесійнай і шматмоўнай. Афіцыйнай мовай дзяржаўных дакументаў і заканадаўства была старабеларуская. Аднак кнігі выдаваліся таксама на царкоўнаславянскай, польскай, латыні і іўрыце з выкарыстаннем розных сістэм пісьма: кірыліцы, лацініцы, яўрэйскіх і арабскіх літар, як, напрыклад, у арабаграфічных рукапісах беларускіх татараў.

> Успомніце, што азначае паняцце «гуманізм».

**Ідэі рымскага права ў Статутах ВКЛ**

Запазычанне ідэй рымскага права і іх адаптацыя ў Статутах Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. адыгралі важную ролю ў развіцці дзяржавы. Статуты замацоўвалі прынцып, паводле якога ўсе людзі, незалежна ад іх багацця або беднасці, падлягалі суду на аснове адзіных прававых нормаў.

**Царкоўна-рэлігійная літаратура**

Аднак панаванне ў ВКЛ феадальных адносін стрымлівала развіццё свецкай культуры. У канцы XV — першай палове XVI ст. на тэрыторыі Беларусі

па-ранейшаму пераважала рэлігійная літаратура. Цэнтральнае месца сярод жанраў царкоўна-рэлігійнай літаратуры займалі кнігі Бібліі і жыцці святых. У эпоху Рэнесанса, калі вырасла цікавасць да традыцый і гістарычнай спадчыны, новае гучанне атрымалі старабеларускія помнікі пісьменства. Шырока перапісваліся і публікаваліся высокамастацкія творы Кірылы Тураўскага. Асаблівай увагай карысталася «Жыцціе Ефрасінні Полацкай».

Друкаваныя выданні рабіліся ўсё больш запатрабаванымі праваслаўнай царквой. Гэта паспрыяла таму, што ў 1491–1493 гг. у г. Кракаве друкаром Швайпольтам Фіёлем, немцам з паходжання, былі выдадзены некалькі богаслужбовых зборнікаў кірылічным шрыфтам.

## КНІГАДРУКАВАННЕ Ў СЛАВЯНСКІХ КРАІНАХ




Успомніце, кім і калі было вынайдзена кнігадрукаванне рухомымі літарамі.

**Беларускі першадрукар**

**2. Францыск Скарына — беларускі першадрукар, асветнік, філосаф і гуманіст.** Сярод усходніх славян першы выдаў кнігу друкарскім спосабам *Францыск Скарына*. У 1517 г. у Празе ён надрукаваў «Псалтыр». Прадмова і пасляслоўе да кнігі былі напісаны старабеларускай мовай, а асноўная частка — старабеларускім варыянтам царкоўнаславянскай мовы. У 1517–1519 гг. Скарына выдаў дзесяць кніг Бібліі ў шасці пераплётах (22 кнігі Старога Запавета пад агульнай назвай «Біблія руска»). У 1519 г. выдавец пераехаў

у Вільню, дзе ў 1522 г. апублікаваў «Малую падарожную кніжыцу», у 1525 г. — «Апостал».

Францыск Скарына зрабіў кніжнае слова даступным для шырокіх колаў насельніцтва. Ён адкрыў новую эпоху ў жыцці беларускага народа. Менавіта таму сёння яго называюць тытанам эпохі Адраджэння на тэрыторыі Беларусі.

Першадрукар зрабіў шмат захадаў для збліжэння царкоўнаславянскай і жывой старабеларускай моў. Ён змяніў літаратурную традыцыю кніжнай справы: у яго выданнях з'явіліся аўтарскія прадмовы, пасляслоўі і каментарыі. Яны не толькі дапоўнілі асноўны тэкст біблейскіх кніг, але і выступілі ў ролі самастойных твораў прыгожага пісьменства. З дапамогаю гравюры Ф. Скарына змяніў мастацтва афармлення кніг.

**Філосаф**

Гэты вялікі вучоны стаў піянерам беларускай навукі і атрымаў ступень доктара медыцыны і доктара вольных навук (філасофіі). У сусветнай культуры ён вядомы таксама як багаслоў, перакладчык, паэт, педагог, дыпламат, прадпрымальнік, заснавальнік аднаго з першых у Еўропе батанічных садоў.

**Асветнік і гуманіст**

Францыск Скарына стаў адным з першых прадстаўнікоў нашай краіны, чыя дзейнасць выйшла за нацыянальныя рамкі. Аднак пры гэтым ён заўсёды заставаўся патрыётам Айчыны і імкнуўся адукаваць родны народ. Друкаванае слова Ф. Скарыны мела мэтай не толькі інфармаванне насельніцтва і практычнае выкарыстанне ў хрысціянскіх храмах, але і фарміраванне сапраўднага грамадзяніна сваёй краіны — адукаванага і выхаванага чалавека.

У сваіх працах асветнік развіваў канцэпцыю прававой дзяржавы. Яго палітычны ідэал заключаўся ў моцнай і адукаванай манархічнай уладзе, якая б падтрымлівала хрысціянскую справядлівасць, законнасць і правапарадак, імкнулася да міру з суседнімі краінамі і спрыяла развіццю духоўнай культуры, рамёстваў і гандлю. Прыкладам увасаблення гэтых

ідэй служылі для яго кіраўнікі і заканадаўцы Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма.

Францыск Скарына зрабіўся першым, хто прынёс на беларускія землі гуманістычнае ўяўленне пра аўтарства. Ён уключаў сваё імя ў выдадзеныя ім кнігі і змяшчаў свой партрэт на гравюрах.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

На цяперашні час выяўлена каля 520 друкаваных экзэмпляраў і 45 рукапісных спісаў кніг Ф. Скарыны. Яны захоўваюцца ў дзяржаўных і прыватных зборах Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Літвы, Польшчы, Расіі, Славеніі, ЗША, Украіны, Чэхіі. У Зале Сарака сярод самых славутых замежных выпускнікоў Падуанскага ўніверсітэта размешчаны партрэт і памятная дошка Ф. Скарыны.

У адной з кніг, выдадзеных Ф. Скарынам, у загалоўку напісана: «Библия Руска выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька, богу ко чти и людем посполитым к доброму научению».

1. *Як у гэтых словах аўтар выразіў мэты выдання?*
2. *Што абазначае знак «сонца і месяц» на гравюры?*
3. *Як вы лічыце, ці можна назваць дзейнасць Скарыны стартапам па нямецкай тэхналогіі?*
4. *У гонар 500-годдзя беларускага кнігадрукавання Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў у абарачэнне серыю памятных манет «Шлях Скарыны». Высветліце, якім чынам прадстаўленыя на манетах гарады звязаны з дзейнасцю асветніка.*



*Гравюра з выдання Ф. Скарыны*

**4. Паслядоўнікі Францыска Скарыны.** Справа, пачатая Ф. Скарынам, была працягнута яго паслядоўнікамі. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі з'яўляліся шматлікія тыпаграфіі. Цэнтры кнігадрукавання былі заснаваны не толькі ў Вільні і іншых буйных гарадах, але і ў невялікіх прыватных мястэчках. У XVI ст. Беларусь зрабілася галоўным у свеце цэнтрам кірылічнага кнігадрукавання.

Усе кнігі, выдадзеныя тыпаграфскім спосабам, утрымлівалі аўтарскія прадмовы і пасляслоўі. Яны былі разлічаны на простага чытача і неслі яму перадавыя ідэі свайго часу.

## ПАСЛЯДОЎНІКІ Ф. СКАРЫНЫ

### Сымон Будны



- заснаваў у Нясвіжы супольна з М. Кавячынскім і Л. Крышкоўскім тыпаграфію;
- пераклаў на старабеларускую мову і выдаў у Нясвіжы ў 1562 г. «Катэхізіс»

### Васіль Цяпінскі

- заснаваў тыпаграфію ў сваім маёнтку Цяпіна;
- пераклаў на старабеларускую мову і апублікаваў у 1570-х гг. «Евангелле»



### Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец

- заснавалі тыпаграфію ў Маскве, выдалі ў 1564 г. першую друкаваную кнігу «Апостал»;
- заснавалі тыпаграфію ў Заблудаве (каля Беластока), у 1568–1569 гг. выпусцілі «Евангелле вучыцельнае»





### Браты Мамонічы



- заснавалі ў Вільні супольна з Пятром Мсціслаўцам тыпаграфію;
- упершыню апублікавалі Статут ВКЛ 1588 г.

### Спірыдон Собаль

- заснаваў у сваім маёнтку Куцейна пад Оршай тыпаграфію;
- апублікаваў у 1631 г. «Буквар» — кнігу для навучання дзяцей грамаце і выхавання ў духу праваслаўя



Чаму прадстаўленых дзеячаў называюць паслядоўнікамі Ф. Скарыны?

Новай з’явай у культурным жыцці насельніцтва Беларусі ў сярэдзіне XVI зрабілася мецэнацтва. Некаторыя адукаваныя беларуска-літоўскія магнаты апекаваліся таленавітымі маладымі людзьмі, спрыялі іх навучанню ў найлепшых універсітэтах Еўропы, запрашалі да сябе вядомых пісьменнікаў, мастакоў, вучоных, збіралі кнігі, музейныя каштоўнасці, помнікі мастацтва, адкрывалі школы-тэатры, тыпаграфіі. Іх двары, напрыклад двор князёў Радзівілаў у Нясвіжы, рабіліся своеасаблівымі культурнымі цэнтрамі.



*Герб Радзівілаў. 1547 г.*

Як вы лічыце, чаму мецэнацтва адыгрывае важную ролю ў развіцці навукі і мастацтва?
Што дабрачыннікі атрымоўваюць узамен, падтрымліваючы развіццё культуры? Назавіце вядомых мецэнатаў ВКЛ.

Рэнесансныя погляды на прызначэнне чалавека → Пашырэнне мецэнацтва ў ВКЛ

Растлумачце прычынна-выніковую сувязь у лагічным ланцужку.

**5. Дасягненні беларускай культуры ў эпоху Адраджэння.** У эпоху Адраджэння ў ВКЛ атрымаў пашырэнне архітэктурны стыль *«рэнесанс»*. З’явіўся новы тып збудаванняў, пры ўзвядзенні якіх асаблівая ўвага надавалася сіметрыі, прапорцыям, геаметрыі і ўпарадкаванасці складовых частак.

**Архітэктура**

У гарадах з магдэбургскім правам з’явіліся ратушы і іншыя грамадскія будынкі. Змянялася планіроўка населеных пунктаў — забудову вялі вакол гандлёвай плошчы. Пачалі будаваць двухпавярховыя «камяніцы» — жылыя цагляныя дамы з чарапічнымі дахамі.

Якія архітэктурныя элементы Мірскага замка паказваюць на тое, што ён быў пабудаваны як абарончае збудаванне? Знайдзіце тры цікавыя гістарычныя факты пра Мірскі замак.

Павялічылася колькасць прыватных замкаў. У канцы XV — пачатку XVI ст. з'явіліся *замкі-цытадэлі*. Яны мелі знешнюю лінію абароны — земляныя валы і равы, напоўненыя вадой.



Мірскі замак. Рэканструкцыя



Замкава-паркавы комплекс «Мір». Гродзенская вобласць. Сучасны выгляд

Змянілася ўнутранае ўбранне грамадзянскіх пабудоў — так, печы пачалі ўпрыгожваць кафляй. Найлепшыя высокамастацкія вырабы мясцовых майстроў, напрыклад паліхромная кафля, сталі шырока вядомыя далёка за межамі ВКЛ.

Успомніце, што было характэрна для праваслаўнай готыкі.



Спаса-Праабражэнскі сабор. Г. Заслаўе. Мінскі раён Мінскай вобласці



Касцёл св. Яна Хрысціцеля. Аг. Камаі. Пастаўскі раён Віцебскай вобласці

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У XVII ст. з беларускіх зямель у Расію пачалі актыўна перасяляцца сяляне, рамеснікі, гандляры, служылыя людзі. Паводле падлікаў беларускага гісторыка Л. С. Абецэдарскага, на 80-я гг. XVII ст. двары беларускіх перасяленцаў складалі не менш за 20 % усіх двароў пасадскага (гарадскога) насельніцтва Масквы.

1. *Адраджэнне ў Беларусі развівалася ў трох асноўных кірунках: пісьменства, архітэктура і народная творчасць. Даведайцеся, што абазначае тэрмін «беларуская рэзь».*
2. *Беларуская кафля, што выкарыстоўвалася для абліцоўкі печаў, камінаў і фасадаў будынкаў, была вядомая за межамі беларускіх зямель. Якія выявы наносілі на яе беларускія майстры?*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады ўнёску выхадцаў з беларускіх зямель у развіццё навукі і культуры Расіі XVI–XVII стст.*



*Фасад другога паверха Круціцкага церамка. Масква. 1681–1694 гг.*

У грамадзянскім і культавым будаўніцтве стыль рэнесанс гарманічна спалучаўся з праваслаўнай готыкай. Гэта стварала ўнікальную асаблівасць архітэктуры ВКЛ.

У XVI–XVII стст. працягнулася ўзвядзенне *храмаў-крэпасцей*: царква Раства Багародзіцы ў Мураванцы (Гродзенская вобласць), касцёл Яна Хрысціцеля (аг. Камаі, Віцебская вобласць), галоўная сінагога-крэпасць (г. Быхаў, Магілёўская вобласць) і інш. Пратэстанты, будуючы кальвінісцкія саборы, імкнуліся да лаканічнасці, прастаты і гармоніі формаў. Сёння мы можам гэта ўбачыць на прыкладзе Спаса-Праабражэнскай царквы (г. Заслаўе, Мінская вобласць), касцёла Унебаўзяцця Панны Марыі (аг. Дзераўная, Мінская вобласць).

Удасканальвалася майстэрства вырабу драўлянай алтарнай скульптуры для касцёлаў. Сфарміравалася *беларуская школа іканапісу*, якая спалучала сярэдневяковыя традыцыі жывапісу і навацыі эпохі Адраджэння. Іканапісцы выкарыстоўвалі алейныя фарбы, імкнуліся рэалістычна паказаць навакольную рэчаіснасць і перадаць чалавечыя эмоцыі.



*Ікона Божай Маці «Адзігітрыя Ерусалімская». Беларусь. XVI ст.*

*Эпоха Адраджэння на тэрыторыі Беларусі цягнулася нядоўга. Тым не менш яна пакінула глыбокі след ва ўсіх сферах культурнага жыцця. Ураджэнец старажытнага Полацка выдатны філосаф, асветнік, гуманіст, вучоны Францыск Скарына ўвайшоў у гісторыю як «айцец» усходнеславянскага кнігадрукавання.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 1455 г. — выданне І. Гутэнбергам першай друкаванай кнігі ў Еўропе | 1517 г. — выданне Ф. Скарынам першай друкаванай кнігі на землях усходніх славян — «Псалтыр» |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. У чым заключаліся асаблівасці культуры ВКЛ эпохі Адраджэння ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі?
2. Як у ВКЛ праяўлялася сувязь гуманізму і Рэфармацыі?
3. Складзіце схему «Дасягненні беларускай культуры ў эпоху Адраджэння».
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце віртуальную гістарычную экскурсію «Дарогамі Францыска Скарыны».